Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Репозиторий БГПУ

Вучэбны матэрыял па тэме

# “НАЗОЎНІК.<br>ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.
Мінск
2018

## ЗМЕСТ

**I. Тэарэтычны раздзел**

1. 1. Назоўнік як часціна мовы

1.2. Лексіка-граматычныя разрады назоўніка

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычнаыя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# I. Тэарэтычны раздзел

## 1.1. Назоўнік як часціна мовы

***Назоўнік*** — самастойная часціна мовы, якая аб'ядноўвае словы з абагульненым значэннем прадметнасці і мае самастойныя граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону. Назоўнікі могуць абазначаць:

- назвы прадметаў: *шафа, кніга, камень*;

- назвы асоб: *студэнт, сястра, чалавек*;
- жывых істот: *лось, камар, кнігаўка*;
- дрэў і раслін: *мурог, хвоя, лён*;
- астранамічных аб'ектаў: *планета, камета, Юпітэр*;
- геаграфічных аб'ектаў*: мора, гара, узгорак*;
- з'яў прыроды: *дождж, туман, адліга*;
- з'яў грамадска-палітычнага жыцця: *рэферэндум, выбары, дэмакратыя;*
- апрадмечаныя прыметы і якасці: *дабрата, шчасце, сумленне;*
- апрадмечаныя дзеянні і стан: *бег, плаванне, касьба*;
- апрадмечаныя лікі: *дзесятак, сотня, двойка, пяцёрка*.

Назоўнікі адказваюць на пытанні х т о? або ш т о?.

Агульнае значэнне прадметнасці назоўнікаў выяўляецца праз незалежныя граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону. Назоўнікі адносяцца да аднаго з трох родаў (мужчынскага, жаночага, ніякага), маюць форму адзіночнага або множнага ліку (*дом* -- *дамы, дзіця* -- *дзеці*), змяняюцца па склонах (Н. *вясна*, Р. *вясны*, В. *вясну* і г. д.).

У сказе назоўнікі звычайна выконваюць ролю дзейніка (у форме назоўнага склону) або дапаўнення (у форме ўскосных склонаў): *Неяк адразу пацяжэлі ад соку гронкі каліны* (Пасл).. *Цёплае паветра нагрэта шчодрым ліпеньскім сонцам (Гр.).*

Назоўнік можа быць у сказе таксама выказнікам, акалічнасцю, недапасаваным азначэннем: *Малыя дрывасекі – браты* (Бяд.). *Побач чыгункі стаяў высокі стары лес* (К-с). *Сцяжынка да вёскі гублялася ў густым арэшніку* (Гал.).

### Лексіка-граматычныя разрады назоўніка

Паводле лексічнага значэння і граматычных асаблівасцей назоўнікі могуць абазначаць агульныя і ўласныя назвы, канкрэтныя і абстрактныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паняцці, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, зборныя, рэчыўныя і адзінкавыя прадметы.

Усе назоўнікі падзяляюцца на агульныя і ўласныя. ***Агульныя*** назоўнікі – гэта назвы цэлых класаў аднародных прадметаў, жывых істот, з'яў прыроды, паняццяў: *будынак, горад, вецер, студэнт*. ***Уласныя*** назоўнікі — індывідуальныя назвы людзей, жывёл, геаграфічных аб'ектаў, прадпрыемстваў, газет, часопісаў, марак і гатункаў вырабаў і інш.: *Скарына, Сяргей, Янка Купала, Беларусь, часопіс "Полымя", Вялікдзень, цукеркі "Знічка".* Уласныя імёны пішуцца з вялікай літары, а назвы прадпрыемстваў, устаноў, машын, кніг, часопісаў і інш. без слова *імя* бяруцца ў двукоссе: *фабрыка "Слодыч", часопіс "Бярозка", цукеркі "Крыжачок"*. Ролю уласных назваў выконваюць не толькі словы, а і словазлучэнні: *Брэсцкая шаша, Старыя Дарогі*.

Уласныя назоўнікі не спалучаюцца з лічэбнікамі і звычайна ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку (*Гомель, Марс, Нёман*), але ёсць асобныя словы і ў форме множнага ліку: *Асіповічы, Смалявічы, Пухавічы, Альпы, Афіны.* Форму множнага ліку маюць імёны і прозвішчы, калі яны абазначаюць групу людзей: твор Янкі Брыля «*Іваны*», раман Ф.М.Дастаеўскага "*БратыКарамазавы",* сям'я *Кур'яновічаў*.

Паміж агульнымі і ўласнымі назоўнікамі існуе пэўная ўзаемасувязь. Некаторыя агульныя назоўнікі, калі набываць індывідуальнае значэнне, могуць пераходзіць ва ўласныя: так узніклі, напрыклад, прозвішчы *Верабей*, *Сарока*, *Ліс*, геаграфічныя назвы *Круглае*, *Глыбокае, Мір*. Некаторыя ўласныя назоўнікі ў сваю чаргу могуць стаць агульнымі: агульныя назоўнікі *рэнтген, вольт, ватман, маўзер, наган, дызель, ампер, кулон, ом, габелен, батыст, рэглан* і інш. пахозяць ад імёнаў асоб, якія былі іх вынаходнікамі, адкрывальнікамі. Напрыклад, агульны назоўнік *ватман* паходзіць ад прозвішча *Ватман* (англійскі фабрыкант, які першым пачаў выраб адпаведнай паперы); назва *габелен* (насценны дыван ручной работы з вытканай на ім карцінай, а таксама дэкаратыўная тканіна) паходзіць ад прозвішча французаў *Габеленаў,* у майстэрнях якіх яны выраблялія з XV ст.; гатунак тканіны *батыст* (тонкая льняная або баваўняная тканіна) атрымаў сваю назву ад імя французскага майстра-ткача XIII ст. *Батыста* Шамбрэ; фрагмет адзення *рэглан* паходзіць ад прозвішча англійскага генерала *Рэглана*, які ў бітве пры Ватэрлоо страціў руку і першым стаў насіць адзенне такога пакрою.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Канкрэтныя*** назоўнікі з'яўляюцца назвамі прадметаў, што існуюць у рэчаіснасці: *будынак, крэсла, дрэва*; з'яў прыроды*: навальніца, вецер;* да канкрэтных адносяцца некаторыя назоўнікі, якія абазначаюць грамадскія падзеі, дзеянні, стан, калі яны ўяўляюцца канкрэтна, паддаюцца лічэнню і змяняюцца па ліках*: адна рэвалюцыя, дзве рэвалюцыі.*. Такія прадметы і з'явы ўспрымаюцца органамі пачуццяў. Як правіла, канкрэтныя назоўнікі маюць формы адзіночнага і множнага лікаў: *стол -- сталы, туман — туманы;* спалучаюцца з колькаснымі і парадкавымі лічэбнікамі: *адно возера, два алоўкі, другі залік, пятае практыкаванне.*

***Абстрактныя*** назоўнікі абазначаюць разнастайныя адцягненыя паняцці, працэсы, дзеянні, уласцівасці, пачуцці, стан: *гонар, павага, смеласць, чырвань*. Яны, як правіла, ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку, не могуць спалучацца з колькаснымі лічэбнікамі, але могуць спалучацца з няпэўна-колькаснымі словамі *многа, мала, шмат, трохі, гэтулькі, столькі, некалькі: шмат гонару, мла павагі*. Некаторыя абстрактныя назоўнікі набываюць форму множнага ліку пры умове канкрэтызацыі: *твае цяжкасці, апошнія выпрабаванні, нашы спатканні*. Некаторыя абстрактныя назоўнікі маюць форму толькі множнага ліку: *абставіны, адведзіны, адносіны, перагаворы, дажынкі* і інш. Канкрэтныя назоўнікі могуць быць назвамі адушаўлёных і неадушаўлёных прадметаў, абстрактныя – толькі неадушаўлёных.

***Адушаўлёныя*** назоўнікі – гэта назвы жывых істот -- людзей, жывёл, птушак, рыб, насякомых: *бацька, студэнт, воўк, камар.**Неадушаўлёныя*** — назвы прадметаў, з'яў прыроды, раслін, абстрактных і разумовых паняццяў: *сцяна, дуб, поспех, памяць*. Паняцце «адушаўлёнасць — неадушаўлёнасць» у граматыцы не адпавядае біялагічнаму паняццю «жывое — нежывое». Так, у граматыцы ўсе назвы раслін (*ружа, ліпа, баравік*) — неадушаўлёныя назоўнікі, а ў біялогіі расліны — жывыя арганізмы. У граматыцы да адушаўлёных належаць назоўнікі — назвы жывых прадметаў, якія могуць самастойна рухацца. Так, да неадушаўлёных адносяцца назоўнікі *народ, атрад, натоўп, статак, моладзь, вучнёўства, студэнцтва, таварыства,* якія маюць зборнае значэнне; да адушаўлёных належаць некаторыя назоўнікі, якія абазначаюць нежывыя істоты: *хобіт, эльф, чорт, вядзьмар, гном;* назвы цацак*: лялька, зайчык, ваверка*; назвы шахматных фігур: *слон, кароль, конь, ферзь*; назвы страў: *карп, шчупак, леш.*

***Зборныя*** назоўнікі абазначаюць сукупнасць аднародных прадметаў або асоб як адзінае цэлае: *чалавецтва, моладзь, гародніна, лісце*. Такія назоўнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўжываюцца ў форме адзіночнага ліку, не паддаюцца лічэнню і не спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі, толькі некаторыя з іх могуць спалучацца з няпэўна-колькаснымі словамі *мала, многа, шмат, трохі, гэтулькі, колькі, столькі, некалькі: многа лісця, шмат моладзі.*

***Рэчыўнымі*** з'яўляюцца назоўнікі, якія абазначаюць назвы рэчываў аднароднага саставу: *медзь, кіслард, шакалад, шоўк*. Да рэчыўных назоўнікаў адносяцца назвы металаў і выкапняў: золата, алюміній, нафта; хімічных элементаў і злучэнняў: *вадарод, гелій, хлор*; прадуктаў харчавання: *малако, хлеб, кава*; лекаў: *анальгін, аспірын*; тканін: *шоўк, атлас* і інш. Такія рэчывы можна дзяліць на часткі, пры гэтым яны захоўваюць назву цэлага. Рэчыўныя назоўнікі, як і зборныя, не паддаюцца лічэнню, але яны могуць вымярацца: *кілаграм цукру, літр алею.* Такія назоўнікі часцей за ўсё ўжываюцца ў форме адзіночнага ліку і не спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі: *цукар, малако, чай, алей,* але могуць спалучацца з няпэўна-колькаснымі словамі *шмат, мала, многа, трохі, гэтулькі, колькі, столькі, некалькі*: *многа бульбы, мала кіслароду, трохі солі.* Некаторыя рэчыўныя назоўнікі маюць форму толькі множнага ліку: *духі, дрожджы, апілкі, кансервы.*

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

1. Як выражаецца катэгарыяльнае значэнне прадметнасці і для якіх лексіка-семантычных груп назоўнікаў яно характэрна?
2. Дайце граматычную характарыстыку назоўніку як часціне мовы. Пакажыце, як суадносяцца лексічнае і граматычнае значэнні назоўніка. На аснове якіх прымет словы адносяць да пэўнага лексіка-граматычнага класа назоўнікаў?
3. Якія прыметы пакладзены ў аснову вылучэння лексіка-граматычных разрадаў назоўніка?
4. Якія супрацьпастаўленні існуюць у лексіка-граматычных разрадах назоўніка?
5. Пры якіх умовах адбываецца пераход уласных назоўнікаў у агульныя і агульных ва ўласныя?
6. Якімі лексічнымі, граматычнымі і словаўтваральнымі асаблівасцямі вызначаюцца канкрэтныя, абстрактныя, зборныя і рэчыўныя назоўнікі?
7. Чым адрозніваецца паняцце канкрэтнасці / абстрактнасці ў лексіцы і марфалогіі? Якія крытэрыі ляжаць у аснове размежавання канкрэтных і абстрактных назоўнікаў? Прывядзіце прыклады пераходу канкрэтных назоўнікаў у абстрактныя і абстрактных у канкрэтныя.
8. Ці маюць абстрактныя, зборныя і рэчыўныя назоўнікі суадносныя формы ліку?
9. На падставе якіх прымет вызначаецца супрацьпастаўленне:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адушаўлёныя – неадушаўлёныя назоўнікі? Як адрозніваюцца паняцці "адушаўлёнасць – неадушаўлёнасць" у граматыцы і "жывое -- нежывое" ў біялогіі? Як выражаецца адушаўлёнасць / неадушаўлёнасць назоўнікаў?

10 Якія адушаўленыя назоўнікі з'уляюцца асабовымі?

**3. Практычнаыя заданні**

**Заданне 1.** Прачытайце і запомніце загадкі. Пакажыце на іх прыкладах адметныя семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і словаўтваральныя рысы назоўніка.

1. Пасярод двара стаіць капа, спераду вілы, ззаду мятла. (Карова)
2. Не араты, не каваль, не плотнік, а першы на вёсцы работнік. (Конь)
3. Дзве галавы, дзве спіны, шэсць ног, адзін хвост. (Чалавек на кані)
4. Каля бочкі качаюцца клубочкі. (Парасяты каля свінні)
5. На полі і ў лузе ходзіць у кажусе. (Авечка)
6. Балабан бяжыць, на ім лес дрыжыць.(Баран)
7. З барадою, а не дзед, з рагамі, а не бык, дояць, а не карова, лыкі дзярэ, а лапці не пляце. (Каза)
8. З людзьмі сябруе, хату вартуе, жыве пад ганкам, хвост абаранкам. (Сабака)
9. Выйшла панна з трасок, а на ёй сорак сарочак, а як вецер павее, гола цела віднее. (Курыца)
10. Ходзіць цар па градзе, носіць блін на барадзе. (Певень)

**Заданне 2.** Складзіце невялікае паведамленне для дзяцей паводле адной з прапанаваных сітуацый, запішыце. Выпішыце назоўнікі, якія абазначаюць асоб і іншых жывых істот, прадметы рэчаіснасці, прыродныя з'явы, апрадмечаныя якасці, апрадмечаныя дзеянні, абстрактныя паняцці.

1. Нам прынеслі маленькае кацяня.
2. Наш сабака мяне выратаваў.
3. Дзеці даглядалі маленькіх куранят.
4. Да нас у сад прытупаў вожык.
5. Дзеці дапамагалі бацькам па гаспадарцы.

**Заданне 3.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак. Выпішыце канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі. Растлумачце, што яны абазначаюць.

Вунь ходзіць па зялёнай лугавіне бусел. Сваім бела-чорным адзеннем і чырвонай дзюбай ён ярка вылучаецца на фоне зялёнай травы і блакітнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неба. Як павольна перастаўляе бусел свае чырвоныя ногі! А дзюбу звесіў уніз, нібы ўважліва вывучае глебу пад нагамі.

Гэты сур'ёзны птах з'яўляецца часткай беларускага краявіду. З людзьмі ён жыве ў дружбе, гняздуецца часта на стрэхах будынкаў, на дрэвах каля хат. Народ любіць бусла, лічыць яго добрым суседам чалавека.

Чаму? Па-першае, ён нікому не прыносіць шкоды. Па-другое, прынята ў народзе думаць: калі бусел зробіць побач гняздо, гэты дом міне бяда, гора. Вядома, гэта толькі так думаюць. Але бусел назаўсёды стаў сімвалам ціхага, спакойнага і шчаслівага жыцця.

Паводле В.Вольскага

**Заданне 4.** Спішыце тэксты. Падкрэсліце канкрэтныя назоўнікі адной рыскай, абстрактныя - дзвюма, вызначце іх семантыку і граматычныя асаблівасці.

1. Наказ сыну

Вазьмі ў сваё сэрца на схову
Дрымоту маўклівых ракіт,
І поле, і луг каляровы,
І родны блакіт.
Вазьмі ў сваё сэрца на схову
Адзінай Айчыны сцягі
І словы купалаўскай мовы
Як спадчынны скарб дарагі.

(А.Кавалюк)

2. О Радзіма, табою напоўнена
сэрца да краю,
І заўжды – ці працую, ці пільна
на вахце стаю, –
Я твой велічны вобраз у думках
сваіх уяўляю
І люблю, як жыццё, я зямлю
маладую тваю!

(П.Панчанка)

**Заданне 5**. Размяжуйце зборныя і рэчыўныя назоўнікі.

Авёс, алешнік, апаратура, бульба, вецце, вуглярод, дваранства, дзетвара, збожжа, звяр'ё, золата, карвалол, каўчук, лёд, лён, макарона, малако, мёд, настаўніцтва, патрыярхат, прафесура, салома, сасоннік, сілас, соль, статак, шоўк, электарат, ячмень.

**Заданне 6**. Вызначце, уласнымі ці агульнымі назоўнікамі з'яўляюцца падкрэсленыя словы. Абгрунтуйце сваю думку.

1. Верыш ты розным нарбутовічам ды мартыневічам (Чарнышэвіч). 2. Усе знаходзяцца на аднолькавай адлегласці ад Бога, але на рознай да Бога (А.Разанаў). 3. А іх любілі, шанавалі, і Коўш люляў іх на цвіку (Ю.Голуб). 4. Мы тройчы дзеці ў вечным крузе: мы – дзеці роднае сям'і, і дзеці Маці-Беларусі, і – дзеці Матухны –Зямлі (Н.Гілевіч). 5. Мной неспазнаная яшчэ, паўз надпісы "Лянок" і "Мода", да плошчы Коласа цячэ евангельская прахалода (Л. Дранько-Майсюк). 6. Каб зразумець Белавежскую пушчу, трэба стаць яе часткай, яе працягам (Я. Рагін). 7. Але мы не ведаем соцень

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тых Пушкіных і Талстых, якія былі ў гушчах працоўных (Кандрат Крапіва). 8. У прадмовах да сваіх “Сялянскіх песняў з-пад Нёмана і Дзвіны” называў наш народ крывічамі ... Ян Чачот (У. Арлоў). 10. Дзіця нараджаецца, і Сварог запальвае зорку; чалавек паміраае, і бог Зніч яго зорку гасіць (А.Петрашкевіч). 11. ...асцярожна, тут наша з вамі Гісторыя (А. Петрашкевіч). 12. Забурліла сіне мора ад віхроў, выйшлі Волгі, Дняпры выйшлі з берагоў (Янка Купала). 13. – Ну, Сымон, да першых зорак можа ў Ліпы сціганём? (Якуб Колас) 14. Да Лёсу на адказнае спатканне пайшлі Здароўе, Шчасце і Каханне (В.Лукша). 15. …ды знойдуцца заўсёды івановы, што памахаць яму гатовы (Кандрат Крапіва). 16. А мы былі гасцямі Саюза пісьменнікаў і мелі шырачэзны прастор для знаёмства з калегамі (І. Шамякін). 17. Былі і свае Чацкія, Арбеніны ( Ракітны). 18. І ўжо нікога больш не праклінаючы, не пазайздросціць зорнаму каўшу (Л.Дранько-Майсюк). 19. Шырока вядомыя літаграфіі М.Басалыгі “Бітва з татарамі”, “Мірскі замак”, “Рагнеда”... (А.Шычко) 20. Той знойдзе ўсё, з кім Дабрачыннасць дружыць, да славы даплыве ён – гэта добра знаю... (А. Міцкевіч). 21. Шуміла быў добры і вясёлы дзядзька з Белага Каменя... (А. Пісьмянкоў). 22. Сэрцы братнім народам і праўду сваю раздалі – Клімукі, Кавалёнкі, Караткевічы, Мележы, Пысіны (П.Панчанка). 25. На сваіх старэнькіх “Жыгулях” скалясіў яе (Беларусь) удоўж і ўпоперак (А. Пісьмянкоў).

**Заданне 7.** Складзіце і запішыце сказы, у якіх дадзеныя назоўнікі выступалі б то як агульныя, то як уласныя; вызначце іх семантыку.

Вера, дызель, крапіва, лявоніха, полымя, чарнобыль.

**Заданне 8.** Выпішыце з тэксту назоўнікі, вызначце іх лексіка-граматычныя разрады, склон і тып скланення.

Вечарэла. Сонца нізка стаяла над горадам і холадна біла ў вокны, у бляшаныя дахі дамоў залацiста-барвовым, безуважным святлом. Трамвай звінеў недзе, і пах, астываючы, нагрэты за дзень асфальт, і пахла, чуйней за ўсё, цэглай і фарбай. Была пустою вуліца; Міхась ішоў, а цень ад яго клаўся на дарогу і соўгаўся паволі, нібы папіхаючы сябе. Раптам побач, ці не за драўляным плотам, у гародчыку, коратка і жаласна ціўкнула птушанё. Гэта быў як бы знак, і хлопец спыніўся і паглядзеў туды. Халаднаватая чырвань аблівала бэз, павеў скразняковага ветру калыхнуў лісце, і цені ад яго затрапяталіся на жоўтай сцяне, і зноў прыцішана-жаласна піскнула птушка.

(М.Стральцоў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ